Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

29 МАЯ 2021 г. СУБОТА № 100 (29469)

ЗВЯЗДА

ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ МАХЛЯРОЎ 3

КАЛІ ЗВЕР АДЧУЎ НЕБЯСПЕКУ... 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Праект пад назвай СНД адбыўся і зноў пацвярджае сваю жыццяздольнасць у гэты няпросты час»



Фота Belta.

Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з удзельнікамі пасяджэння Савета кіраўнікоў урада СНД, якое ўчора прайшло ў Мінску. Беларусь, як старшыня Садружнасці ў 2021 годзе, выступае на наданне ёй дынамікі і аўтарытэту, а таксама за плённае супрацоўніцтва краін. Адпаведнае пытанне стане ключавой тэмай сустрэчы Прэзідэнта з кіраўнікамі ўрадаў СНД.

«Мне прыемна, што вы прыехалі ў Мінск, — павітаў удзельнікаў саміту Аляксандр Лукашэнка. — Наколькі я назіраў напярэдадні, многія змаглі пагаварыць тэт-а-тэт, высветліць усе адносіны і перспектывы. Я рады, што вы на беларускай зямлі, нягледзячы на атакі на Беларусь у асноўным у інтэрнэце. Вы бачыце, што абстаноўка ў нас спакойная. Мінск па-ранейшаму ціхі, спакойны, утульны горад для жыцця людзей. Так што сардэчна запрашаем і грамадзян вашых дзяржаў».

«Пытанняў для абмеркавання заўсёды было шмат»

«Трэба адкрывацца, весці жывы дыялог, ісці адзін аднаму насустрач. Пагадзіцеся, ніякія нават самыя сучасныя тэхнічныя сродкі сувязі, якімі мы вымушаны актыўна карыстацца, не могуць замяніць даверлівых зносін. Тым больш што пытанняў для абмеркавання заўсёды было шмат, і сёння іх не менш», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён канстатаваў: сёння можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што праект пад назвай СНД адбыўся і зноў пацвярджае сваю жыццяздольнасць у гэты няпросты час.

«Нават развал Савецкага Саюза не змог канчаткова парваць трывалыя інтэграцыйныя сувязі паміж брацкімі савецкімі рэспублікамі. Гэта была вялікая краіна ва ўсіх адносінах — вельмі прыцягальны геапалітычны цэнтр з развітой эканомікай і перадавой культурай, дзе мірна жылі больш за сотню розных этнасаў», — сказаў беларускі лідар.

«Мы маем каласальны вопыт некалькіх пакаленняў, шматвяковыя традыцыі дружбы і добрасуседства. Сілу духоўнага адзінства савецкіх народаў прадэманстравалі нашы дзяды і прадзеды. Мы маем тое, што нам падарылі дзяды і прадзеды, бацькі, перамогшы ў самай крывавай вайне мінулага стагоддзя», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Самы галоўны патэнцыял нас усіх — гэта наш дух»

Адным з аргументаў на карысць інтэграцыі Аляксандр Лукашэнка назваў мэтанакіраваную работу, якая праводзіцца знешнімі сіламі супраць Садружнасці. «Сёння ў наяўнасці — відавочнае грэбаванне прынцыпамі міжнароднага права і рост колькасці выпадкаў прымянення так званага права моцнага. Шчыра кажучы, я апошнім часам усё больш сумняваюся, ці моцныя яны настолькі, як гэта дэманструюць», — заўважыў Прэзідэнт.

Але, па словах кіраўніка дзяржавы, логіка апанентаў цалкам зразумелая. «Па-першае, мы ўмацоўваемся, адпаведна, здольныя перашкодзіць іх планам па выбудоўванні аднапалярнага свету. Па-другое, нашы краіны маюць каласальны патэнцыял, што выклікае непакой у канкурэнтаў. Самы галоўны патэнцыял нас усіх — гэта наш дух. І, па-трэцяе, гэты патэнцыял можа быць памножаны, калі мы працягнем паглыбляць нашу інтэграцыю», — растлумачыў ён.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што адным з непарушных прыярытэтаў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь сёння з'яўляецца развіццё сувязяў унутры аб'яднання. Па яго словах, найбольш актуальныя задачы Садружнасці пазначаны ў праграмных дакументах беларускага старшынства, яны таксама прасоўваюцца ў фармаце ЕАЭС. Многія задачы ўжо рэалізаваны ў рамках Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Прэзідэнт Беларусі заўважыў, што асноўную ўвагу ўрадаў краін СНД і яе рабочых органаў трэба засяродзіць на развіцці агульнай эканамічнай прасторы. «Скажу адкрыта і прама: калі мы ў найбліжэйшы час гэта не вырашым, казаць аб існаванні эфектыўнай Садружнасці Незалежных Дзяржаў не давядзецца. Настаў час, канчаткова расставіўшы ўсе кропкі над «і», прыняць рашэнне па фарміраванні гэтага падмурка адносін нашых дзяржаў. Падмурак — гэта эканоміка», — заявіў беларускі лідар.

Аснова для паспяховага развіцця эканамічнай інтэграцыі, па словах кіраўніка дзяржавы, — удасканаленне дакументаў Садружнасці і гарманізацыя іх з нарматыўна-прававой базай Еўразійскага эканамічнага саюза. «І потым вельмі эфектыўна рухацца наперад», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Давайце не страцім адзін аднаго»

Беларускі лідар звярнуў увагу на тое, што разам краіны Садружнасці змогуць больш эфектыўна супрацьстаяць новым глабальным выклікам, у тым ліку распаўсюджванню каранавіруснай інфекцыі і яе наступствам, а таксама спробам расхістванне сітуацыі ў розных рэгіёнах.

СТАР. 2

СУСТРЭЧА ПРЭЗІДЭНТАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ Ў СОЧЫ ПАКАЗАЛА ВАЖНАСЦЬ ЗАМАЦАВАННЯ ПАЗІТЫЎНЫХ ТЭНДЭНЦЫЙ У СУПРАЦОЎНІЦТВЕ ДЗВЮХ КРАІН

Сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна прайшла ўчора ўвечары ў Сочы. Пра гэта праінфармаваў Telegram-канал «Пул Першага», паведамляе БелТА.

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыбыў у Сочы ў пятніцу, у другой палове дня.

Кіраўнік беларускай дзяржавы ў пачатку сустрэчы адзначыў, што ідзе спроба разгайдаць сітуацыю ў Беларусі да ўзроўню жніўня мінулага года. «Я вас праінфармую. Карыстаючыся такімі даверлівымі адносінамі з вамі, захапіў некаторыя дакументы. Пакажу вам, каб вы разумелі, што адбываецца», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Ён нагадаў пра перыяд мінулага года, калі розным краінам давялося вывозіць сваіх грамадзян з іншых дзяржаў на фоне абмежаванняў, выкліканых пандэміяй. «Напэўна, больш ніхто так, як Расія, не рабіў сваіх людзей, вывозячы з курортаў. Разам з Індыяй вы і нам дапамагалі, чалавек 200 вывезлі беларусаў, дзесьці і мы адначасова вывозілі расіян — «Белавія» наша. Тады ж усе закрыліся. Адзін аэрапорт у Мінску працаваў, і вывозілі сваіх людзей. Яны (шэраг замежных краін, у тым ліку ў Еўрасаюзе, ЗША. — **Заўв. БелТА**) усё закрылі, — нагадаў кіраўнік дзяржавы. — Яны папрасілі «Белавія», і наша кампанія вывезла тысячы чалавек: шведаў, немцаў, палякаў, літоўцаў, амерыканцаў. Вывозілі ў Мінск, пакольскі аэрапорт быў адкрыты адзіны. А потым амерыканцаў у нас забіралі ці мы ім туды адвозілі. Не ўяўляеце, як яны былі нам удзячныя — «Белавіі» — за вывезеных людзей, выратаваных».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт акцэнтаваў увагу на рэакцыі гэтых жа краін на выпадак з самалётам Ryanair, які здзейсніў пасадку ў Мінску з-за паведамлення аб мініраванні. «Гэты выпадак з самалётам, да якога «Белавія» не мае ніякага дачынення», — падкрэсліў беларускі лідар.

Там самалётаў «Белавія» не было (у інцыдэнце з самалётам Ryanair. — **Заўв. БелТА**), яна базіруецца ў аэрапорце. Чужы самалёт. Папракаюць ваенных, што мы яго там пасадзілі. «Белавія» пры чым? І калі б не вы — у гэты перыяд, я гляджу, Масква адмаўляе: ляціце вакол Беларусі — не прымаюць самалёты ў Маскве. Адразу адчулі. Але за што пакаралі працоўны калектыў «Белавія»? За тое, што яны ў кавід іх вывозілі тысячамі. Вось іх абліччa», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Уладзімір Пуцін у сувязі з гэтым прыгадаў выпадак, калі на Захадзе ў свой час пасадзілі самалёт прэзідэнта «Балівіі». «Прэзідэнта вывелі з самалёта, і нічога — цішыня», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся і зазначыў, што ёсць і іншыя выпадкі ў свеце, калі прымушалі да пасадкі самалёты тых ці іншых краін і пры гэтым ніхто не крычаў з гэтай прычыны. «Проста зразумела, што ад нас хочуць гэтыя «сябры» нашы заходнія. Што тут абмяркоўваць... Але няма тых вышынь, якія бальшавікі не бралі. Возьмем і мы», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Далей лідары абмеркавалі двухбаковае гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Уладзімір Пуцін, у прыватнасці, адзначыў рост беларуска-расійскага тавараабароту і падкрэсліў важнасць замацавання пазітыўных тэндэнцый у супрацоўніцтве дзвюх краін. У першым кварталe бягучага года Расія застаецца ключавым гандлёва-эканамічным партнёрам Беларусі. Мы назіраем значны рост тавараабароту — 18,4 %. Гэта добрая тэндэнцыя. Важна яе захаваць пры актыўнай рабоце ўрадаў», — сказаў расійскі лідар.

Прэзідэнт Беларусі адзначыў, што, сапраўды, шмат было размоў наконт цяперашняй сустрэчы. «Нечакана нават для мяне. Вось, сустракаецца вельмі часта і іншае... Але гэта наш план. Галоўнае, што мы рухаемся наперад. Бы правільна адзначылі рост тавараабароту. Мы пралічваем зараз літаральна кожную лінію працэнта. І бачым, што мы перасягнём сёлета — Беларусь і Расія — свой тавараабарот дакавідна ўзроўню. Тут якраз у нас тэмпы нядрэнныя».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў Беларусі тэмп росту ВУП прыкладна такі ж, як і ў Расіі. «Нам жа, ведаеце, прадраклі ці ледзь не стагнацыю нейкую. Эканоміка ў Расіі расце. Натуральна, прывязная да Расіі, і наша эканоміка нармальна рухаецца. Але заўсёды ёсць жадаючыя падкінуць нам праблем. Вы пра іх ведаеце», — сказаў ён.

Найлепшы від на родны горад

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Магілёўскія школьнікі Паліна НЯЧАЕВА, Ягор КОЙПІШ і Ульяна ПЯРМІНАВА, якія пасхаова скончылі дзясяты клас, майскім надвячоркам прыйшлі на набярэжную, з якой адкрываецца цудоўны від на Дняпро.

Важная справа

ВЫХАВАЦЬ ВУЧОНАГА МОЖА ТОЛЬКІ ВУЧОНЫ,

або Чаму ў навуку павінны прыходзіць асобы?

Ёсць меркаванне, што рухаць навуку наперад павінна моладзь. У маладых заўсёды шмат ідэй, яны не баяцца праяўляць ініцыятыву, для іх не існуе бясспрэчных аўтарытэтаў, яны ўсё падвяргаюць сумненню і, галоўнае, не баяцца выходзіць за рамкі звыклых уяўленняў і рызыкаваць. А для навукі патрэбны менавіта смеласць і дзёрзкасць. Але ці часта можна пачуць ад маладых пра іх жаданне стаць даследчыкам? Прафесія вучонага паступова страчвае для маладога пакалення былую прывабнасць. Таму пытанні падрыхтоўкі інтэлектуальнай эліты застаюцца актуальнымі для ўсіх краін. І Беларусь — не выключэнне.

Дваццаць гадоў таму ў структуры Нацыянальнай акадэміі навук з'явілася навучальная ўстанова новага тыпу — Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў. Асноўная яго мэта — умацаванне сувязі вышэйшай школы з акадэмічнымі навукова-даследчымі ўстановамі. Сёння ў акадэміі каля 20 працэнтаў навуковых кадраў складае моладзь ва ўзросце да 29 гадоў. Падчас рэспубліканскага маладзёжнага форуму «Беларусь інтэлектуальная», які прайшоў у Акадэміі навук з удзелам 200 маладых даследчыкаў, рэктар Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Марат ЖЫЛІНСКІ расказаў пра тое, як выхоўваецца інтэлектуальная эліта краіны і з якімі праблемамі даводзіцца сутыкацца.

На перадавой акадэмічнай навукі

— Падрыхтоўка даследчыкаў высокай навуковай кваліфікацыі — найважнейшая задача, сфармуляваная ў прынятай на II з'ездзе беларускіх вучоных Стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040», — паведаміў ён. — Пад кіраўніцтвам акадэмікаў, членаў-карэспандэнтаў, вядучых вучоных і навуковых супрацоўнікаў арганізацый у магістратуры Акадэміі навук вядзецца планамерная работа па падрыхтоўцы навуковага кадравага патэнцыялу. Сёння Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў рыхтуе магістраў па запатрабаваных фундаментальных спецыяльнасцях для навуковых арганізацый Нацыянальнай акадэміі навук. Падкрэслю, што для гэтых мэт задзейнічана матэрыяльна-тэхнічная база ўсіх арганізацый НАН, якая з'яўляецца найбуйнейшай навукова-тэхнічнай карпарацыяй у краіне. У акадэміі дзейнічае шмат навукова-практычных цэнтраў і інавацыйных вытворчасцяў.

Фарміраванне будучых вучоных адбываецца не ў вучэбных аўдыторыях, а, так бы мовіць, на перадавой акадэмічнай навукі — у лабараторыях акадэмічных інстытутаў і навукова-практычных цэнтраў, на эксперыментальных пляцоўках, археалагічных раскопках.

Дарэчы, 90 працэнтаў кіраўнікоў магістарскіх дысертацый — гэта акадэмічныя вучоныя. Запатрабаванасць выпускнікоў інстытута пацвярджаецца іх стапрацэнтным размеркаваннем. Дзяржава робіць усё, каб у маладых вучоных было першае працоўнае месца, каб яны былі забяспечаны жыллём, мелі магчымасць для творчага і кар'ернага росту. Па выніках Рэспубліканскага студэнцкага конкурсу навуковых работ кожны пяты выпускнік нашай магістратуры быў узнагароджаны дыпломам Міністэрства адукацыі.

СТАР. 2

КАРОТКА

- **«Вялікі камень» падпісаў пагадненне з Беларускім саюзам журналістаў.**
- Генпракурор узбудзіў крымінальную справу ў сувязі з інцыдэнтам з дзяржсцягам Беларусі ў Рызе.
- **Мазырскі НПЗ з 1 чэрвеня прыступае да капітальнага рамонту.**

- «Белнасценне» заклала дэманстрацыйныя палі сельгаспаслін у кожнай вобласці.
- **Паслуга платнай вакцынацыі можа хутка з'явіцца ў беларускіх здраўніцах.**
- Аднаўленчае лячэнне пасля COVID-19 даступна ў 70 санаторыях Беларусі.

Размова па сутнасці

ДОБРЫЯ СПРАВЫ ДЛЯ ПРЫРОДЫ

Як сіламі паляўнічых і рыбаловаў падтрымліваецца дзікая фаўна

Сёлета адна з найстарэйшых грамадскіх арганізацый краіны — рэспубліканскае дзяржаўна-грамадскае аб'яднанне «Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў» — адзначае сваё 100-годдзе. «Звязда» пагаварыла са старшынёй таварыства Юрыем ШУМСКІМ пра тое, чым сёння жывуць яго ўдзельнікі.

Старшыня таварыства Юрый ШУМСКІ.

ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ПАЛЯЎНІЧЫХ — АСАБЛІВЫЯ ЎМОВЫ

— Юрый Іванавіч, якія задачы аб'яднання вы лічыце галоўнымі?

— Асноўныя дзяржаўна значныя задачы былі вызначаны адпаведным указам Прэзідэнта. Сярод іх — стварэнне членам аб'яднання ўмоў для паляванні і аматарскага рыбалоўства, вядзенне высокаэфектыўных паляўнічых і рыбалоўных гаспадарак, арганізацыя навучання грамадзян краіны правілам паляванні і аматарскага рыбалоўства, арганізацыя і вядзенне паляўнічага сабакаводства і іншае.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

«Праект пад назвай СНД адбыўся...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт шчыра сказаў: не трэба думаць, што падзеі Расіі, Украіны, Беларусі адбываюцца дзесьці далёка і не датычаць іншых. «Мы ніколі не думалі, што ў мірны, спакойнай Беларусі з талерантным народам магчымы падобныя з'явы. Разумееце, якімі метадамі яны дзейнічалі, колькі грошай патрачана, якія сеткі ствараюцца. У іх дзеяннях і размовы не было аб правах чалавека. Стваралі выбуховы момант для пачатку мяцяжу. Многія вашы дзяржавы адчувалі гэта на сабе, і мы адчуваем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што справа не ў тым, каб усе сталі дапамагаць Беларусі. Прэзідэнт заклікаў рабіць тое, што краіны ўмелі рабіць у мінулым стагоддзі, у часы Савецкага Саюза.

«У нас была інтэграваная эканоміка, па многіх пазіцыях яна застаецца ў кааперацыі. Парваць нас вельмі цяжка, таму што эканоміка завязаная. Давайце спакойна рабіць гэтую справу, ствараць фундамент, каб людзі адчулі, што толк ёсць. Давайце не страцім адзін аднаго», — прызнаўся кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, як калісьці папяражваў лідараў Украіны і Грузіі не спяшацца выходзіць з СНД. «Выйсці заўсёды паспеш, а вось увайсці назад — шмат выдаткаў і праблем будзе. Таму, паважаныя сябры, ніколі не спяшайцеся», — заклікаў ён.

«Аб'яднаўшыся, мы змаглі выстаяць»

Асобную ўвагу ў сваім выступленні Аляксандр Лукашэнка ўдзяліў праблеме пандэміі каранавіруса і барацьбы з яе наступствамі. «Ніхто б не мог падумаць, што гэты працэс, не толькі сама хвароба, так перакуліць свет. Але, аб'яднаўшыся, мы паказалі, што можам выстаяць», — заўважыў лідар.

Прэзідэнт Беларусі падзякаваў кіраўніцтву Расіі і асабіста прэм'ер-міністру Міхаілу Мішусціну за дапамогу з вакцынай. Ён расказаў, што на мінулай сустрэчы са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуцінам вымушаны быў адмаркоўваці дапамогу грамадзянам заходніх краін. «Хоць іх кіраўніцтва паводзіць сябе непрыстойна ў адносінах да Беларусі, вы бачыце, які запыт на «Спутнік V» у грамадзян заходніх дзяржаў. Людзі просяць дапамозе. Мы дамовіліся з прэзідэнтам Расіі, што Беларусь адкрые некалькі пераходаў на граніцы, уладкаваць там адпаведныя паталкі, калі трэба. Бальніц у нас на граніцы хапае, каб прыняць жадаючых людзей з тэрыторыі Польшчы, Літвы і іншых дзяржаў і асабліва Украіны. Там жа нашы людзі жывуць, на адной мове размаўляем, і трэба аказаць ім дапамогу ў вакцынацыі», — сказаў ён. Зараз гэта адпрацоўваецца. У Беларусі ў спакойным тэмпе адбываецца вакцынацыя насельніцтва без «вар'яцтва» па гэтай тэме.

«Галоўнае для нас цяпер — абараніць старых і людзей, якія ў першую чаргу схільныя да захворвання каранавірусам. Мы іх падштурхоўваем, але не настойваем. Абавязковай вакцынацыі няма і не будзе. Але трэба дапамагчы сусядзям, і асабліва ўкраінцам», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Людзі павінны размаўляць»

«У перыяд пандэміі пацярпелі не толькі эканамічныя сувязі, але і сацыяльна-гуманітарныя. Іх таксама трэба аднаўляць. Перш за ўсё гэта датычыцца чалавечых кантактаў, сфер культуры, навукі, адукацыі, спорту, турызму. Я даўно пагыблены ў гэтую праблему», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён заклікаў краіны СНД актыўна адкрывацца, спрыяць зносінам людзей паміж сабой, узнаўляць транспартныя сувязі. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ён даўно праінфармаваны аб сітуацыі ў дзяржавах, і яна ўсюды прыкладна аднолькавая. Ён падкрэсліў, што сітуацыю з каранавірусам усе перажывуць і трэба даць людзям магчымасць мець зносіны.

«Калі ў нас больш-менш нармальна, але вырашылося ў гэтых адносінах усімі праўдамі і няпраўдамі, давайце адкрывацца адзін аднаму», — заклікаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што Беларусь з самага пачатку пандэміі не закрывала свае граніцы. А меры, прынятыя беларускімі ўладамі для барацьбы з інфекцыяй, выклікалі ў суседніх краінах здзіўленне, асабліва ахоўны здароўя.

Ён звярнуў увагу, што пандэмія — не было б шчасця,ды няшчасце дапамагло — паказала, наколькі краіны-партнёры СНД блізкія адна да адной і як здольны падтрымліваць.

«Не страціўшы тое, што ёсць, ісці наперад»

«Перакананы, што пры наяўнасці розных інтэграцыйных фарматаў у выпрашэнні агульных рэгіянальных праблем павінны быць задзейнічаны ўсе краіны Садружнасці», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Ён у пазітыўным ключы ацаніў правядзенне пасяджэння Еўразійскага міжпарламенцкага савета 29 красавіка бягучага года ў Казані, дзе ў статусе назіральнікаў і ганаровых гасцей удзельнічалі прадстаўнікі Малдовы, Узбекістана, Таджыкістана і Туркменістана.

«Відавочна, што гэтая ідэя расійскага боку. Я ўдзячны, што вы так паступілі. Тым больш што мы набліжаемся да 2025 года — значнай вяхі ў развіцці ЕАЭС, калі павінна быць завершана фарміраванне агульных рынкаў газу, нафты і нафтапрадукту, электраэнергетыкі, адзінага фінансавага рынку, адзінай транспартнай прасторы, скаардынаваній аграпрамысловай палітыкі», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы не стаў утойваць наяўнасць складанасцяў і што яны заўсёды будуць. «Любая вялікая справа без іх не абыходзіцца. Пры гэтым грамадскасць павінна бачыць ход і вынікі нашай працы. І трэба кожны дзень рабіць хоць якінебудзь крок наперад», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка, карыстаючыся выпадкам, павіншаваў удзельнікаў сустрэчы з 30-годдзем з дня ўтварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў і запрасіў гасцей як мага часцей прыязджаць у Беларусь, запэўніўшы, што тут іх заўсёды будуць рады бачыць і цёпла прымаць.

Валерыя СЦЯЦКО.

ВЫХАВАЦЬ ВУЧОНАГА МОЖА ТОЛЬКІ ВУЧОНЫ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Абарона магістарскіх дысертацый паказвае высокі ўзровень кампетэнцый магістрантаў. Сярэдняя ацэнка абароны выпускных работ — не ніжэйшая за 8,9 бала. А 75 працэнтаў тых, хто абараніўся, атрымліваюць аднаго ці «9» і «10» балаў.

Важна, што ў акадэмічныя аргінізацыі пасля заканчэння нашай магістратуры ідуць працаваць каля 70 працэнтаў ее выпускнікоў. Таксама выпускнікі акадэмічнай магістратуры складаюць 50 працэнтаў тых, хто паступае ў аспірантуру акадэміі на дзённае аддзяленне. Усе магістранты пасляхова здаюць экзамены па агульнаадукацыйных дысцыплінах. Гэтыя вынікі пацвярджаюць высокі ўзровень ведаў магістрантаў і, галоўнае, іх здольнасць да працягу навукова-даследчай дзейнасці.

Дысцыплінаваць мысленне

Марат Жылінскі лічыць, што трэба пастаянна вывучаць інтарэсы, патрэбы, матывы і каштоўнасці ўстаноўкі маладых даследчыкаў.

Аспірантура — першая ступень у сістэме падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі пасля ВНУ, а кандыдацкая дысертацыя — гэта кваліфікацыйнае даследаванне, якое дае права прафесійна займацца навуковай дзейнасцю. Зараз у Акадэміі навук праграмы аспірантуры рэалізуюваюцца ў 52 навуковых арганізацыях па 137 навуковых спецыяльнасцях.

У цяперашні час у аспірантуры навучаюцца 566 чалавек, з іх 305 — на дзённай форме, 67 — на завочнай і 194 — у фармаце саіскальніцтва.

Прыём у аспірантуру складае 140—150 чалавек у год. Акадэмія валодае для іх падрыхтоўкі ўсімі рэсурсамі: развітой інфраструктурай, наяўнасцю прызнаных ва ўсім свеце навуковых школ. Больш як 50 працэнтаў навуковых кіраўнікоў аспірантаў складаюць дактары навук. А якімі ж матывамі кіруецца моладзь, каб пайсці вучыцца спачатку ў магістратуру, а потым і ў аспірантуру?

— На наш погляд, гэта жаданне самаўдасканальвацца і магчымасць займацца навуковай дзейнасцю, прасоўванне ў кар'еры, жаданне працаваць у навуковай установе ці вышэйшай навучальнай установе, павысіць свой сацыяльны статус і самасвядомасць, — разважае Марат Жылінскі. — Дарэчы, стыпендыі аспіранта складае 655 рублёў, дактаранта — 1060 рублёў. А памер стыпендыі аспіранта, які з'яўляецца лаўрэатам спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, складае амаль тысячу рублёў.

Для таго каб ісці ў аспірантуру, павінен быць створаны навуковы зачын. Аспірантура прызначана толькі для тых, каму ёсць куды рухацца, і гэта трэба даводзіць моладзі.

Канешне, эфектыўнасць аспірантуры ў вялікай ступені залежыць ад таго, хто туды паступае, якія мэты і задачы ставіць перад сабой будучы вучоны: проста абараніць дысертацыю або адбыцца ў навуцы? Чым жа прыцягнае маладых навучанне ў акадэмічнай аспірантуры? Гэта пашырэнне свайго навуковага кругагляду: размова ідзе пра магчымасць адкрывацца новыя галіны ведаў, інтэлектуальны рост, магчымасць стасункаў з дзеячамі навукі, аспірантамі з іншых аддзелаў і лабараторый. Нашы акадэмічныя аспіранты канстатуюць, што даследчая дзейнасць дазваляе дысцыплінаваць мысленне. Мы мяркуем, што, прымаючы рашэнне аб прызначэнні таго ці іншага вучонага навуковым кіраўніком аспіранта, трэба ўлічваць, наколькі ён валодае навукова-практычным досведам у плане аказання дапамогі маладому даследчыку. Але, вядома, павінна быць і жаданне самога маладога вучонага адбыцца ў навуцы.

Карпатлівая самастойная праца

Спыніўся рэктар Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН і на праблемах. Адна з іх — недастатковая метадычная падрыхтоўка. Не заўсёды аспіранты падрыхтаваны да патрабаванняў па напісанні дысертацый і рэфератаў. Акрамя таго, ёсць пытанні з абаронай дысертацый. «Колькасць выпускнікоў, якія прайшлі ў тэрмін папярэдняю экспертызу дысертацый, застаецца невысокай. Разам з тым выніковасць акадэмічнай аспірантуры па колькасці абароненых дысертацый нашмат вышэйшая, чым звычайна: каля 35 працэнтаў выпускнікоў нашай аспірантуры абараняюць дысертацыі на працягу двух гадоў пасля яе заканчэння».

Пры паступленні нядаўніх студэнты недастаткова выразна ўяўляюць сабе, як будзе праходзіць іх вучоба, бо аспірантура мае на ўвазе пераважна самастойную форму атрымання ведаў — не на лекцыях і семінарах, а за кошт карпатлівай самастойнай навукова-даследчай работы. Аспірант, як правіла, сам выбірае кірунку, якія яго цікавяць, і тэму даследавання, вывучае навуковую літаратуру і аналізуе атрыманую інфармацыю. Хоць тэматыка дысертацыйнага даследавання (гэта вельмі важны момант) павінна быць звязана не толькі з асабістым інтарэсам даследчыка і навуковай школы, якую ён прадстаўляе, але і з задачамі развіцця навукі і дзяржавы ўвогуле. Таксама яна павінна быць узгоднена з планамі навуковых даследаванняў Акадэміі навук і праграмай навукова-даследчай дзейнасці ў цэлым.

Радыкальнае змяненне доступу да навуковай інфармацыі, дзякуючы інтэрнэту, прывяло да рэзкага пашырэння магчымасцяў кантактаў з вучонымі з розных краін, а таксама даступнасці разнастайных крыніц інфармацыі. Развіццё дзеянай тэндэнцыі ўзмацніне ўвагу да этычных праблем навуковага даследавання, напрыклад, праблемы дакладных спасылак не толькі на публікацыі, але і на ідэі.

Акрамя таго, веды хутка састарваюцца, у сувязі з гэтым патрабуюць тэрміновай нераарыентацыі ў ўдаладненні, і тут вялікую ролю адыгрывае навуковы кіраўнік аспіранта. Да таго ж узрастанне ролі інфармацыйных працэсаў у навуцы цягне за сабой неабходнасць набыцця аспірантамі вопыту ўдзелу ў калектыўных навуковых даследаваннях, калі стварацца навуковыя калектывы, што маюць адзінную даследчую праграму. Сучасная навука — гэта камандная гульня.

Як вядома, у ідэале кожны выпускнік аспірантуры павінен выйсці на абарону кандыдацкай або да заканчэння свайі вучобы, або ў першы год пасля выпуску. Але так адбываецца далёка не заўсёды. І прычын на гэта шмат.

Увогуле, для таго каб ісці ў аспірантуру, павінен быць створаны навуковы зачын. Калі ісці туды «пустым», то за тры гады вучобы нічога ў навуцы здзейсніць дакладна не атрымаецца. Павінна быць стратэгія, упэўненасць у тым, што выканаеш навуковае даследаванне, напішаш дысертацыю, абаронішся... Аспірантура прызначана толькі для тых, каму ёсць куды рухацца, і гэта трэба даводзіць моладзі. Вучоны — гэта «штучны тавар». Як не з кожнага можна выхаваць алімпійскага чэмпіёна, так і не кожнаму суджана стаць вучоным і здзейсніць прарыў. Толькі адзінкі вучоных будуць лепшымі генератарамі ідэй, і ў навуку павінны прыходзіць асобы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

• Будзь у курсе!

Калі звычайна пры адборы ў магістратуру ўніверсітэты арыентуюцца галоўным чынам на сваіх выпускнікоў першай ступені і аддаюць перавагу ім, то паступіць у магістратуру Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН можа абсалютна кожны таленавіты і адпантаны навукай малады чалавек. Калі ён скончыў рэгіянальную ВНУ, яму не закрыты шлях у вялікую навуку. Ад яго патрабуюцца толькі веды і моцнае жаданне.

У Інстытуце падрыхтоўкі навуковых кадраў няма першай ступені. Ёсць толькі магістратура, аспірантура і дактарантура.



Фота pixels.com

Парламенцкі дзённік

Спецыяльная камісія падрыхтуе законапраект аб зменаці Канстытуцыі

Спецыяльная камісія па падрыхтоўцы праекта закона «Аб зменаці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь» створана ў Палаце прадстаўнікоў. Такое рашэнне прынялі ўчора на пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў.

Змены прадугледжваюць магчымасць правядзення выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў 29-га склікання адначасова з прызначэннем выбараў у Палату прадстаўнікоў восьмага склікання. **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** на пасяджэнні падкрэсліў, што кіраўнік дзяржавы гэтую прапанову падтрымаў:

— Адпаведны законапраект аб зменаці Канстытуцыі быў унесены Прэзідэнтам у Палату прадстаўнікоў. Рэгламент Палаты прадстаўнікоў прадугледжвае, што для работы над законапраектам нам неабходна стварыць спецыяльную камісію, — адзначыў спікер.

Уладзімір Андрэйчанка адзначыў, што папярэднія сесійныя месяцы былі напоўнены шэрагам значных мерапрыемстваў. Ключавым з іх з'яўляецца сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з парламентарыямі, членамі Канстытуцыйнай камісіі, прадстаўнікамі СМІ і шэрагу дзяржаўных органаў, якая прайшла 26 мая.

— Адбылася адкрытая і вельмі змястоўная размова па самых вострых пытаннях бягучай сітуацыі. І зараз дэпутатам неабходна забяспечыць выкананне тых задач, якія паставіў перад намі кіраўнік дзяржавы на мерапрыемстве. Вядома, перш за ўсё гэта пастаянная работа з нашымі грамадзянамі па месцы жыхарства, — адзначыў Уладзімір Андрэйчанка.

Па словах **намесніка старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Віктара СВІЛЫ,** законапраект павінен быць гатовы да 4 чэрвеня, а прыняты ў першым чытанні ўжо на гэтай сесіі, у другім — не раней чым праз тры месяцы. Нагадаем, што наступная сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу павінна адкрыцца ў пачатку кастрычніка.

Дэпутат адзначыў, што ў склад спецыяльнай камісіі ўвайшлі людзі з вялікім вопытам. Узначаліў яе старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Валянцін Семяняка.

Алена КРАВЕЦ.

Блізкая ўлада

Людзі павінны задаваць вострыя пытанні

Гэта адзначыла намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Вольга ЧУПРЫС падчас рабочай паездкі ў Маладзечна, перадае БелТА.

У Маладзечне Вольга Чупрыс правяла прыём грамадзян, а таксама прыняла ўдзел у пасяджэнні райвыканкама, дзе абмяркоўваці вынікі маніторынгу эфектыўнасці мер, якія прымаюцца ў горадзе і раёне для выканання дырэктывы Прэзідэнта ад 27 снежня 2006 года № 2 «Аб дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату і павышэнні якасці забеспячэння жыццядзейнасці насельніцтва».

На прыём да намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта звярнуліся жыхары Маладзечна, Навапалацка і іншых гарадоў. Праблемы насельніцтва падчас сустрэчы таксама вырашаў **старшыня райвыканкама Юрый ГОРЛАЎ.** Як падкрэсліла падчас мерапрыемства Вольга Чупрыс, на прыём грамадзяне звярталіся са складанымі праблемамі, якія не могуць быць вырашаны адразу ж. Усе звароты ўзяты на кантроль. Падрыхтавана дарожная карта асноўных і прыватных праблем насельніцтва горада, якія адміністрацыя і райвыканкам будуць вырашаць сумесна.

Меркаванне

ПА СПРАВАХ І СЛОВАХ

На затрыманне «проста журналіста» Пратасевіча

Я ўвогуле чалавек не крыважэрны і да людзей стаўлюся з павагай і шкадаванне. Але, калі з'явілася паведамленне аб тым, што затрымалі Пратасевіча, першай рэакцыяй было: «Нарэшце!»

Можна гаварыць аб затрыманні чалавека, які падазраваецца ў тэрарызме і экстрэмізме, з пункту гледжання добрай работы спецслужб. Але я не пра тое. Для мяне асабіста гэта сведчанне таго, што за паскудства, якое робіш іншым людзям, абавязкова даводзіцца плаціць. Што нельга беспакарана іграць чалавечымі лёсамі. Заўважце, я не пра дзяржаву, якой ён сваімі дзеяннямі таксама, несумненна, нанёс урон. Дзяржава выстрымала і стала мацнейшай. А вось людзі... Паламаныя лёсы, разбураныя сем'і — усё гэта на сумленні Рамана Пратасевіча і яго хаўрусніка.

Яны ж, пачынаючы з мінулага лета, гулялі-забаўляліся. Хлапчукі, якія ў дзяцінстве не нагуляліся ў салдацкі ці іншыя настольныя гульні, селі за камп'ютар і з хлапчукоў ператварыліся ў манстраў. Бо пачалі гуляць у людзей. Людзей сваёй краіны, якая перастала быць для іх Радзімай. Тое, што рабілася ў нашых гарадах летам і восенню мінулага года, — у многім на іх сумленні. «Стаповімся ў счэпкі!» — пісалі яны. «Злівайце інфармацыю аб супрацоўніках АМАП!» — пісалі яны. «Выходзім быць ментоў!» — пісалі яны, указваючы пры гэтым месца і час, кудь выходзіць. «Малайцы, партызаны! Зноў спынілі цягнік!» — хвалілі яны тых, хто нацягнаў дрот на чыгункы, ставячы пад пагрозу жыцці соцень чалавек... Іх чыталі і, як трусікі, загіпназаваныя ўдавам, рабілі ўсё, што яны раілі, гэткія самыя хлапчукі, якія выраслі ў цяпліных бытавых умовах, даралі да трыццаці гадкоў і, як кажуць у народзе, не атрымлівалі кухталёў на вясковай дыскатэцы. «Вы будзеце героямі новай Беларусі!» — абяцалі яны. І «новыя герої» ў большасці сваёй не зусім уладкаваныя ў жыцці, але ж былі сярод іх і паспяховыя студэнты, і праграмісты, і бацькі немалых сем'яў, і жанчыны, — ішлі будаваць барыкады і паліць пакрышкі... Пасля, калі з «гераізмам» атрымаўся аблом, колькі іх каялася на камеру з аднымі і тымі ж словамі: «Паддаўся ўплыву дэструктыўных Telegram-каналаў... А супрацоўнікі гэтых самых каналаў пазіраваліў Варшаве з выразам: «Нас не дагоніш!» і расказалі свайму «калегу» пра тое, што «зарплата» ў іх — якая там зарплата — усяго паўтары тысячы еўра ў месяц...

Проста журналіст, кажаце? З якога, выбачайце, боку, ён журналіст? З таго, дзе пад пазыўным «Кім» заяваў на Данбасе ў складзе батальёна «Азоў»? Пазіраваў на камеру ў камуфляжы з аўтаматам у руках? Цяпер яго абаронцы кажуць, маўляў, гэта была пастаноўка, а так працаваў там як карспандэнт. Проста-такі герой «з лейкай і блакнотам». Толькі тыя, хто зараз робіць з Пратасевіча «проста журналіста», забыліся, што інтэрнэт памятае ўсё. Там жа захаваліся не толькі яго фоткі а-ля галівудскі «салдат удачы», але ж і яго інтэрв'ю — «Беларускага салдата з украінскага палка «Азоў» — байца атрада «Пагоня» з пазыўным «Кім». «Першы бой практычна для любога чалавека, хай нават і выдатна падкаванага тэарэтычна, — сумесь жывёльнага страху, неразумення таго, што адбываецца, агню, зямлі і бетону. Галоўнае ў такой сітуацыі — опытныя браты па зброі або камандзір, які выведзе са стану здранцвення цябе і арганізм. А далей самае галоўнае — не страціць галаву і ўвасабліва слухаць указанні вопытных байцоў...» «Што датычыцца адчуванняў у плане першай стральбы са зброі ў баявой сітуацыі — то ў мяне ў галаве была толькі адна думка: «Альбо ты, або цябе». Зрэшты, я ні пра што не шкадую...» «Мой прыезд на вайну быў абсалютна абдуманы і ўзважаны...» «Кожны з нас — прафесійны баец і воін...» Гэта цытаты з таго інтэрв'ю ў адкрытым доступе. Вы і цяпер упэўнены, што ў мінскім азрапорце затрымалі «проста журналіста»?

• Тым часам

Двацацць чалавек затрыманы за абразлівыя каментарыі ў адрас пілотаў, якія загінулі ў Баранавічах

Такая інфармацыя прагучала ў эфіры тэлеканала «Беларусь 1». Паведамляецца, што Следчы камітэт пачаў крымінальную справу па артыкуле 130 Крымінальнага кодэкса («Наўмысныя дзеянні, накіраваныя на распальванне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай альбо іншай сацыяльнай варожасці ці рознІ»).

У эфіры заявілі, што выліўшлі каментаграду супрацоўнікі ГУБАЗІК, а затрыманы кваліфікуюць былі на працягу сутак. Нагадаем: пасля трагедыі ў Баранавічах Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да старшыні КДБ і запатрабаваў высветліць асобы тых, хто пішаў негатыўныя каментарыі пра загінулых лётчыкаў.

Інтэрнэт таксама захавае для гісторыі і сведчанні відавочцаў, як «бедны Рома», калі даведаўся, што самалёт садзіцца ў Мінску, хапаўся за галаву, бегаў па салоне, дрыжэў і казаў, што яму пагражае страшнае пакаранне. Яшчэ адзін вельмі яскравы штрых да партрэта паскуднікаў, які зразумець, што за напаскудзнае давядзецца плаціць. Не, не герой, нават блізка не герой...

Што да пакарання. Яго, канешне, будзе вызначаць суд пасля заканчэння расследавання, у ходзе якога, думаецца, мы даведаемся яшчэ шмат цікавага з біяграфіі «журналіста і блогера». Але ў тым, што шмат людзей, якія рэальна пацярпелі ад Ромкавых віртуальных «гульняў у рэвалюцыю», ужо пажадалі мяу ўсяго «найлепшага», можна нават не сумнявацца. А словы і думкі часам маюць уласцівасць матэрыялізавацца.

Аляксей КЛІМАЎ.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении первых повторных электронных торгов № 2021.Б.002.00019

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении первых повторных электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Минский завод строительных материалов», УНП 100008102, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 455-5Б/2018 в экономическом суде г. Минска.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:

№ лота	Наименование	Начальная цена без НДС, руб.	Минимальная цена
1	Станок универсальный консольно-фрезерный, инв. № 500898 (лот 11/01-2021)	24 800,00	14 880,00
2	Экструдер VAP65, инв. № 501108 (лот № 13/01-2021)	722 000,00	433 200,00
3	Резательное устройство, тип A-UV, инв. № 501105 (лот № 14/01-2021)	114 000,00	68 400,00
4	Робот садки с захватом, инв. № 501706 (лот № 15/01-2021)	280 000,00	168 000,00
5	Робот садки с захватом, инв. № 501707 (лот №16/01-2021)	280 000,00	168 000,00
6	Сушильный барабан dz.8x2.0, инв. № 501257 (лот № 17/01-2021)	56 900,00	34 140,00
7	Дереворубка ALFA, инв. № 501346 (лот № 18/01-2021)	45 100,00	27 060,00
8	Мельница высокопроизводительная smmcalfa, инв. № 501348 (лот № 20/01-2021)	33 500,00	20 100,00
9	Вибророхот двухэтажный alfa, инв. № 501347 (лот № 21/01-2021)	22 200,00	13 320,00
10	Барабан первичного измельчения rz01, инв. № 501817 (лот № 22/01-2021)	30 900,00	18 540,00
11	Металлоискатель, инв. № 501350 (лот № 23/01-2021)	36 300,00	21 780,00
12	Питатель в-2000 с бункером, инв. № 501317 (лот № 24/01-2021)	10 200,00	6 120,00
13	Питатель ленточный ясмк-488, инв. № 501354 (лот № 25/01-2021)	12 600,00	7 560,00
14	Просеивающее устройство alfa, инв. № 501344 (лот № 27/01-2021)	3 900,00	2 340,00
15	Бульдозер Б-170 М103, инв. № 400454 (лот № 7/01-2021)	11 800,00	7 080,00
16	Манипулятор гидравлический м-75, инв. № 501358 (лот № 28/01-2021)	10 000,00	6 000,00
17	Питатель в-800, инв. № 501399 (лот № 29/01-2021)	6 100,00	3 660,00
18	Распределительный шнек, инв. № 501349 (лот № 30/01-2021)	4 300,00	2 580,00
19	Пресс испытательный ИП-250М, инв. № 501359 (лот № 42/01-2021)	20 400,00	12 240,00
20	Грохот на линию с приемным бункером, инв. № 281 (лот № 43/01-2021)	1 300,00	780,00
21	Циклон для линии дробления, инв. № 100074 (лот № 44/01-2021)	680,00	408,00
22	Циклон для линии дробления, инв. № 200075 (лот № 46/01-2021)	830,00	498,00
23	Питатель пластинчатый для линии дробления, инв. № 280 (лот № 47/01-2021)	1 900,00	1 140,00
24	Циклон для линии дробления, инв. № 200076 (лот № 48/01-2021)	680,00	408,00
25	Циклон для линии дробления, инв. № 200077 (лот № 49/01-2021)	680,00	408,00
26	Устройство для затарки тоннас. с приемным бункером на линию дробления, инв. № 500571 (лот № 50/01-2021)	2 800,00	1 680,00
27	Конвейер № 1 на линии дробления, инв. № 276 (лот № 51/01-2021)	3 500,00	2 100,00
28	Конвейер № 2 на линии дробления, инв. № 277 (лот № 52/01-2021)	2 700,00	1 620,00
29	Конвейер № 3 на линии дробления, инв. № 279 (лот № 53/01-2021)	2 100,00	1 260,00
30	Шкаф JA-11, инв. № 3952 (лот № 55/01-2021)	479 000,00	287 400,00
31	Шкаф JA-21, инв. № 3953 (лот № 56/01-2021)	190 000,00	114 000,00
32	Шкаф KA-11, инв. № 3954 (лот № 57/01-2021)	832 000,00	499 200,00

Имущество, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Я. Мавра, 47.
Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.
Имеющиеся обременения: нет.
Дата и время начала и завершения первых повторных электронных торгов: 16.06.2021 с 9.00 до 16.00.
Первые повторные электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by.
Прием документов осуществляется на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by с 9.00 01.06.2021 по 16.00 15.06.2021.
Для участия в торгах на электронной торговой ой площадке по электронному адресу http://etpvit.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 16.00 15.06.2021.
Задатки: по лоту № 1 в сумме 2480,00 (две тысячи четыреста восемьдесят рублей), **по лоту № 2** в сумме 72 200,00 (семьдесят две тысячи двести рублей), **по лоту № 3** в сумме 11 400,00 (одиннадцать тысяч четыреста рублей), **по лоту № 4** в сумме 28 000,00 (двадцать восемь тысяч рублей), **по лоту № 5** в сумме 28 000,00 (двадцать восемь тысяч рублей); **по лоту № 6** в сумме 5 690,00 (пять тысяч шестьсот девяносто рублей), **по лоту № 7** в сумме 4 510,00 (четыре тысячи пятьсот десять рублей), **по лоту № 8** в сумме 3 350 (три тысячи триста пятьдесят рублей), **по лоту № 9** в сумме 2 220,00 (две тысячи двести двадцать рублей), **по лоту № 10** в сумме 3 090,00 (три тысячи девяносто рублей), **по лоту № 11** в сумме 3 630,00 (три тысячи шестьсот тридцать рублей), **по лоту № 12** в сумме 1 020,00 (одна тысяча двадцать рублей), **по лоту № 13** в сумме 1 260,00 (одна тысяча двести шестьдесят рублей), **по лоту № 14** в сумме 380,00 (триста девяносто рублей), **по лоту № 15** в сумме 1 180,00 (одна тысяча сто восемьдесят рублей), **по лоту № 16** в сумме 1 000,00 (одна тысяча рублей), **по лоту № 17** в сумме 610,00 (шестьсот десять рублей), **по лоту № 18** в сумме 430,00 (четыреста тридцать рублей), **по лоту № 19** в сумме 2 040,00 (две тысячи сорок рублей), **по лоту № 20** в сумме 130,00 (сто тридцать рублей), по **лоту № 21** в сумме 68,00 (шестьдесят восемь рублей), **по лоту № 22** в сумме 83,00 (восемьдесят три рубля), **по лоту № 23** в сумме 190,00 (сто девяносто рублей), **по лоту № 24** в сумме 68,00 (шестьдесят восемь рублей), **по лоту № 25** в сумме 68,00 (шестьдесят восемь рублей), **по лоту № 26** в сумме 280,00 (двести восемьдесят рублей), **по лоту № 27** в сумме 350,00 (триста пятьдесят рублей), **по лоту № 28** в сумме 270,00 (двести семьдесят рублей), **по лоту № 29** в сумме 210,00 (двести десять рублей), **по лоту № 30** в сумме 47 900,00 (сорок семь тысяч девятьсот рублей), **по лоту №31** в сумме 19 000,00 (девятнадцать тысяч рублей), **по лоту № 32** в сумме 83 200,00 (восемьдесят три тысячи двести рублей) должны быть зачислены на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк», г. Минск, БИК МТБКBY22.
Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.
Победитель торгов единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан заключить договор купли-продажи в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества в соответствии с договором купли-продажи не позднее 30 дней со дня проведения электронных торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов; возместить затраты за организацию и проведение торгов, в т. ч. затраты по оценке имущества; оплатить затраты на обслуживание ЭТП.
Справочная информация
Контактный телефон антикризисного управляющего +375 17 374 23 93.
Контактный телефон для осмотра объектов + 375 (44) 793 63 23.
Контактные телефоны лица, организующего торги на основании договора поручения: 8(021) 48-20-11, 8 (029) 884-96-79.
Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) с 01.06.2021 по 15.06.2021 с 09.00 до 16.30 по предварительному согласованию с Продавцом по месту нахождения имущества (г. Минск, ул. Я. Мавра, 47).
Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно смете затрат, затраты на обслуживание ЭТП определяются согласно прейскуранту ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by до начала торгов.
Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

У цэнтры ўвагі

СУПРАЦЬ НАРКОТЫКАЎ — СУМЕСНЫМІ НАМАГАННЯМІ

Міністэрства ўнутраных спраў і Беларуская праваслаўная царква падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы прафілактыкі наркаманіі і ўключэння ў незаконны абарот наркотыкаў моладзі. Сустрэча з удзелам Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі, з міністрам унутраных спраў Іванам Кубраковым прайшла ў музеі МУС.

Іван Кубракоў адзначыў, што падпісаным пагадненнем прадугледжана, што МУС і Беларуская праваслаўная царква будуць супрацоўнічаць па ўсіх напрамках для прафілактыкі наркапагрозы ў беларускім грамадстве.

— Мы пастаянна працуем з усімі дзяржаўнымі органамі ў дадзеным кірунку, таму што гэта вельмі важна, — перакананы міністр. — Трэба прызнаць: праблема ў грамадстве ёсць. Самае дрэннае, што ўсё больш і больш у свеце, не толькі ў Беларусі, нарказалежнымі становяцца ў тым ліку непаўналетнія дзеці. На сёння з улікам змякчэння заканадаўства за нарказлачынствы мы бачым, што ў пэўнай ступені пачынае ўзрастаць колькасць перадазіровак наркотыкамі, больш выяўляем закладак. Таму імкнёмся працаваць па ўсіх напрамках менавіта на прафілактыку. Важна не дапусціць, каб наркотыкі ішлі ў нашу краіну. Дарослыя і дзеці павінны разумець, што гэта бяда і ні да чаго добрага яна не прыводзіць. І сённяшняя падзея — яшчэ адзін крок да дасягнення мэты. Упэўнены, што намаганні, якія намі робяцца, выратуюць не адно жыццё і лёсы маладых людзей.

У сваю чаргу мітрапаліт Веніямін падкрэсліў, што Беларуская праваслаўная царква працуе ў сферы прафілактыкі наркаманіі і ўключэння ў незаконны абарот наркотыкаў моладзі пастаянна. «Як толькі паўстала гэтая праблема, яна адразу ж стала прадметам занепакоенасці святароў, — сведчыць мітрапаліт. — Цяпер задача заключаецца ў тым, каб існуючы вопыт разгледзець, абагульніць, абраць найлепшае і ў адпаведнасці з гэтым працягваць работу, прычым каб яна была сістэмная і планавая».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Кампетэнтна

«ЗА КОЖНЫМ ЗЛАЧЫНСТВАМ СТАІЦЬ КАНКРЭТНЫ ЧАЛАВЕК»

Каб не стаць ахвярай махляроў у сферы інфармацыйных тэхналогій, варта прытрымлівацца элементарных правілаў лічбавай гігіены

У акружэнні кожнага з нас, за рэдкім выключэннем, няма такіх людзей, якіх б не трапілі на «вуду» кіберзлачынцаў. Ужо не першы год праваахоўнікі папярэджваюць: не перадавайце свае банкаўскія даныя незнаёмцам! Аднак людзі па-ранейшаму перакананы, што гэта іх не закране. І, будучы неаднаразова праінфармаванымі, усё роўна дыктуюць махлярам свае асабістыя даныя, а потым, абураючыся, ідуць пісаць заяву ў міліцыю...

Што адбываецца са свядомасцю дарослых адукаваных людзей, як засцерагчы сябе ад кіберзлачынцаў, а таксама якая адказнасць чакае тых, хто, шукаючы лёгкія грошы, ідзе на грабежніцтва ў віртуальным асяроддзі, карэспандэнту «Звязды» расказаў **начальнік управлення па супрацьдзеянні кіберзлачынству галоўнага ўпраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкама палкоўнік міліцыі Аляксей НОВАШ.**

— Аляксей Уладзіміравіч, адсочваючы крымінальную зводку, складаецца ўражанне, што апошнім часам зладзействаў у сферы інфармацыйных тэхналогій значна больш, чым тых, да якіх мы прызвычаіліся...

— Любая новая сфера жыццядзейнасці, якая з'яўляецца ў нашым соцыуме, як правіла, накіравана на атрыманне пэўнай карысці. Так было і 30 гадоў таму, калі ў Беларусі пачалі актыўна развівацца лічбавыя тэхналогіі. Сёння мы не ўяўляем жыцця без камп'ютара, тэлефона, планшэта, іншых інавацыйных тэхналогій. Цікавіць гэтая сфера і зладзеяў, якія вышукваюць шляхі для лёгкага заробку. Інтэрнэт іх прываблівае высокай ступенню ананімнасці: мы можам мець зносіны адзін з адным, выкарыстоўваючы пэўныя нікі, праграмныя прадукты, якія дазваляюць мяняць нумары тэлефонаў, нумары IP-адрасоў. Чым больш жыццё чалавека ўцягнута ў глабальную сетку, тым актыўней пераходзіць туды і злачынная дзейнасць.

— Праваахоўніку лягчэй устанавіць злачынцу — рэальнага або віртуальнага?

— Любы чалавек, які здзяйсняе крымінальна адказнае дзеянне, з'яўляецца злачынцам. І незалежна ад таго, як ён гэта робіць: фізічна або віртуальна. За кожным зладзействам стаіць канкрэтны чалавек. Калі, напрыклад, скралі сумку альбо ўзламалі машыну, мы разумеем, што нам трэба праглядзець камеры відэанаязірання, зняць адбіткі пальцаў, вывучыць іншыя фізічныя сляды. Тыя асобы, якія здзяйсняюць грабежніцтва ў інтэрнэце, таксама пакідаюць сляды. Толькі электронныя. За імі стаяць такія ж фізічныя асобы, якіх мы таксама ўстанаўліваем, аднак гэта патрабуе больш часу. У першую чаргу, гэта звязана з тым, што ў глабальнай сетцы могуць здзяйсняць злачынствы людзі, якія знаходзяцца на іншым канцы зямнога шара. У такіх выпадках мы карыстаемся дапамогай нашых калег з іншых дзяржаў — уключаюцца механізмы міжнароднага супрацоўніцтва.

— Устанаўліваць асобы кіберзлачынцаў, напэўна, могуць толькі высокаадукаваныя спецыялісты... Хто служыць ва ўпраўленні?

— З улікам таго, што гэта адносна новая сфера дзейнасці, тут патрэбны спецыяльныя веды ў ІТ-сферы. Паколькі сфера новая, многія займаюцца самаадукацыяй, праходзяць курсы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. Маючы вопыт і пэўныя навыкі, мы спрабуем ісці ў нагу з часам, дадаткова вывучаючы новыя тэндэнцыі.

— Колькі ўжо гаворыцца аб тым, каб грамадзяне выплі асцярожныя са сваімі банкаўскімі рахункамі, аднак па-ранейшаму трапляюць на хітрыкі кіберзлачынцаў. Чаму так адбываецца? Нашы людзі яшчэ да канца не ўсвядомілі, што і ў інфармацыйным асяроддзі адбываюцца правапарушэнні?

— Глабальнае ўяваходжанне ў наша жыццё лічбавых тэхналогій успрымаецца з нейкай баязлівасцю, асабліва людзьмі старэйшага пакалення. Многія баяцца таго, да чаго не могуць дакрануцца. Як дзейнічаюць махляры? Прыцягваюць для сваіх мэт кваліфікаваных псіхолагаў, якія прафесійна націскаюць на тыя балючыя кропкі, якія хвалююць. Уявіце: чалавеку старэйшага ўзросту тэлефаную супрацоўнік банка і кажа, што з яго рахунку спрабуюць скрасці грошы. За савецкім часам людзі пазбаўляліся сваіх збераженняў — для старэйшага пакалення гэта балючая тэма. Таму, калі, прадстаўляючыся супрацоўнікамі банка, злымысніклі прапануюць назваць карыстальніку свае персанальныя даныя з мэтай іх выцягам бы быццам бы праглядзець камеры відэанаязірання, зняць адбіткі пальцаў, вывучыць іншыя фізічныя сляды. Тыя асобы, якія здзяйсняюць грабежніцтва ў інтэрнэце, таксама пакідаюць сляды. Толькі электронныя. За імі стаяць такія ж фізічныя асобы, якіх мы таксама ўстанаўліваем, аднак гэта патрабуе больш часу. У першую чаргу, гэта звязана з тым, што ў глабальнай сетцы могуць здзяйсняць злачынствы людзі, якія знаходзяцца на іншым канцы зямнога шара. У такіх выпадках мы карыстаемся дапамогай нашых калег з іншых дзяржаў — уключаюцца механізмы міжнароднага супрацоўніцтва.

— Устанаўліваць асобы кіберзлачынцаў, напэўна, могуць толькі высокаадукаваныя спецыялісты... Хто служыць ва ўпраўленні?

— З улікам таго, што гэта адносна новая сфера дзейнасці, тут патрэбны спецыяльныя веды ў ІТ-сферы. Паколькі сфера новая, многія займаюцца самаадукацыяй, праходзяць курсы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. Маючы вопыт і пэўныя навыкі, мы спрабуем ісці ў нагу з часам, дадаткова вывучаючы новыя тэндэнцыі.

— Колькі ўжо гаворыцца аб тым, каб грамадзяне выплі асцярожныя са сваімі банкаўскімі рахункамі, аднак па-ранейшаму трапляюць на хітрыкі кіберзлачынцаў. Чаму так адбываецца? Нашы людзі яшчэ да канца не ўсвядомілі, што і ў інфармацыйным асяроддзі адбываюцца правапарушэнні?

